

# Вучоны, крытык, педагог…

6 красавіка 2012 г. пасля цяжкай працяглай хваробы на 80-м годзе пайшоў з жыцця адзін з найвядомых беларускіх тэатразнаўцаў, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Анатоль Вікенцьевіч Сабалеўскі.

Анатоль Сабалеўскі нарадзіўся 27 мая 1932 г. у вёсцы Андрыеўшчына Дзяржынскага раёна (Міншчына) ў сялянскай сям'і. Пасля вайны, закончыўшы сямігодку і выявіўшы выдатныя здольнасці да матэматыкі, ён паступіў у Мінскае педвучылішча, якое паспяхова скончыў у 1953 г. Цяжка нават зразумець, як вясковы хлопец, не маючы ніякай інфармацыі і нават уяўлення пра сцэнічнае мастацтва, звязаў сваё далейшае жыццё менавіта з тэатрам.

Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі БДУ, падчас вучобы ў якім і пачалася яго актыўная тэатральна-крытычная і літаратурная дзейнасць, А. Сабалеўскі скончыў аспірантуру пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага ў Маскве. З 1961 г. працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і адначасова выкладаў у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Затым загадваў там кафедрай гісторыі і тэорыі мастацтваў, мовы і літаратуры, а з 1984 па 1989 быў рэктарам БДТМІ. Ён арганізатар і галоўны рэдактар часопіса "Тэатральная Беларусь" (пазнейшая назва "Тэатральная творчасць"), адначасова з 1993-га — загадчык кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. У 2000 г. А. Сабалеўскі вярнуўся на працу ў ІМЭФ і да выкладчыцкай дзейнасці ў БДАМ, дзе плённа працаваў амаль да апошніх месяцаў свайго жыцця.

А. Сабалеўскі глыбока даследаваў пытанні гісторыі, тэорыі і сучаснай практыкі беларускага тэатра, драматургіі, праблемы нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў тэатральным мастацтве, узаемасувязей розных тэатральных культур, творчасць дзеячаў сцэны. Ён аўтар больш як 500 артыкулаў, аповесці "Жылі-былі хлопцы..." (1961), шэрагу апавяданняў; укладальнік, рэдактар тэкстаў, аўтар уступных артыкулаў і каментарыяў, раздзелаў для выданняў па тэатральным мастацтве; кніг: "Рампай асветленае: Тэатральна-крытычныя артыкулы" (1962), "Уладар дум чалавечых: Творчасць народнага артыста СССР Барыса Платонава" (1964), "Ад п'есы — да спектакля" (1965), "Белорусская драматургия в театрах народов СССР" (1972), "Глеб Глебаў: Жыццё і творчасць вялікага беларускага камедыйнага акцёра" (1994) і іншых. Апошняя яго кніга — "Майстры, падзеі, акалічнасці" (2011).

Дзейнасць вучонага і педагога А. Сабалеўскага высока ацэнена за межамі Беларусі. Камісія па прысуджэнні міжнародных прэмій узнагародзіла яго Залатым медалём "UNITY" ("Адзінства"). Ён — акадэмік Міжнароднай акадэміі навук аб прыродзе і грамадстве; ганаровы доктар навук Ташкенцкага дзяржаўнага інстытута мастацтваў імя М. Уйгура, вучоны, добра вядомы ў Расіі, Украіне, Малдове, Кіргізіі, Грузіі і Казахстане.

Светлая памяць пра Анатоля Вікенцьевіча Сабалеўскага назаўжды застанецца ў сэрцах яго сяброў, калег і вучняў.

**Ад імя калектыву Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў**
**М. Баразна, Р. Смольскі,**
**В. Іваноўскі, А. Бохан (і інш.)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ